Г. У. Трафімава, С. А. Трафімаў

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ 1





Г. У. Трафімава, С. А. Трафімаў

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

Вучэбны дапаможнік для 1 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*



МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2017

Правообладатель Национальный институт образования

УДК [502+3+613](075.2=161.3)
ББК 20.1.я71
Т65

Р э ц э н з е н т ы:

дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт *А. Г. Сарока*;

метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа №131 г. Мінска» (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце *Т. В. Шантур*)

**Трафімава, Г. У.**
Т65 Чалавек і свет : вучэб. дапам. для 1-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : для работы ў класе / Г. У. Трафімава, С. А. Трафімаў. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — 64 с. : іл.
ISBN 978-985-559-782-8.

**УДК [502+3+613](075.2=161.3)**
**ББК 20.1.я71**

**ISBN 978-985-559-782-8**

© Трафімава Г. У., Трафімаў С. А., 2017
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2017

Правообладатель Национальный институт образования

## Дарагія вучні!

Гэта кніга — ваш памочнік на ўроках па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет». Уважліва разглядайце малюнкі і выконвайце заданні. Гэта дапаможа вам даведацца шмат новага і цікавага.

### Умоўныя абазначэнні:

 — адкажыце на пытанне;

 — работа ў парах;

 — работа ў групах;

 — зрабіце самі;

 — station назірайце;

 — чытае настаўнік;

 — даведайцеся больш з кнігі для чытання «Человек и мир. 1 класс».

Правообладатель Национальный институт образования

## НАША РАДЗІМА —

Што вы ведаеце пра сваю краіну? Як называецца яе галоўны горад?










Наша краіна — Беларусь. Галоўны горад краіны называецца сталіцай. Сталіца нашай Радзімы — Мінск.

Што намалявана на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь? Як выглядае Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь?

Дзе вы бачылі герб і сцяг Рэспублікі Беларусь?



Правообладатель Национальный институт образования

# БЕЛАРУСЬ

с. 8–11

Разгледзьце фотаздымкі. Раскажыце пра сталіцу нашай Радзімы.













Дзе вы жывяце? Назавіце свой дамашні адрас і адрас сваёй школы.



Правообладатель Национальный институт образования

# ШТО ТАКОЕ

Што намалявана на малюнках? Што адносіцца да прыроды, а што створана чалавекам?





АБ’ЕКТЫ ПРАЦЫ ЧАЛАВЕКА — ВЫРАБЫ

АБ’ЕКТЫ ПРЫРОДЫ

Што вы можаце самі зрабіць з ліста паперы або кавалка пластыліну?



Правообладатель Национальный институт образования

# ПРЫРОДА



Разгледзьце малюнкі. Чаго намалявана больш: вырабаў або аб’ектаў прыроды? Патлумачце свой адказ.

Паглядзіце ў акно. Назавіце аб’екты прыроды, якія бачыце.



Правообладатель Национальный институт образования

## ЖЫВАЯ І НЕЖЫВАЯ

Разгледзьце жывёл на малюнках і назавіце іх. Якія расліны намаляваў мастак? Што агульнае ў раслін і жывёл?





ЖЫВЁЛЫ

РАСЛІНЫ

Жывёлы і расліны — **аб'екты жывой прыроды**. Яны нараджаюцца, дыхаюць, харчуюцца, растуць, пакідаюць патомства.

## СОНЦА — КРЫНІЦА СВЯТЛА І ЦЯПЛА



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРЫРОДА

Разгледзьце малюнкі. Па сілуэтах вызначце аб’екты прыроды.




Прывядзіце свае прыклады аб’ектаў жывой прыроды.





Гэта аб’екты жывой прыроды? Чаму?

Сонца, паветра, вада, камяні, пясок — **аб’екты нежывой прыроды**. Яны не могуць расці, дыхаць, харчавацца, пакідаць патомства.

**ДЛЯ ЎСЯГО ЖЫВОГА НА ЗЯМЛІ.**



Правообладатель Национальный институт образования

# ЗМЯНЕННІ Ў НЕЖЫВОЙ

?

Якія месяцы года «схаваліся» ў прыказцы «Ад восені да лета павароту няма»? Які месяц восені зараз на календары?





Што змяняецца ў нежывой прыродзе з прыходам восені? Чаму восенню становіцца халадней?

Восенню Сонца над зямлёй паднімаецца не так высока, як летам. Дні становяцца карацейшымі. Зямля атрымлівае менш цяпла. Паветра становіцца халаднейшым. Астываюць вада і глеба.



Правообладатель Национальный институт образования

# ПРЫРОДЗЕ ВОСЕННЮ

с. 22–23

Якія ападкі бываюць летам, а якія — восенню? Чым восеньскія дажджы адрозніваюцца ад летніх?













Ці часта восенню бываюць туманы? Што вы пра іх ведаеце?



У якім восеньскім месяцы больш за ўсё туманаў?

Што ўвосень можна ўбачыць на лужынах? Што можна заўважыць на халоднай зямлі і траве? З чым гэта звязана?

З’яўленне лёду на лужынах, іней на траве і глебе — прыкметы замаразкаў восенню.



Правообладатель Национальный институт образования

# РАСЛІНЫ — ЧАСТКА ЖЫВОЙ ПРЫРОДЫ.

Чаму расліны адносяць да жывой прыроды? Ці могуць яны пражыць без нежывой прыроды? Чаму?





Як асенняе пахаладанне ўплывае на дрэвы, кусты, травяністыя расліны?

Восенню ў многіх дрэў і кустоў змяняецца афарбоўка лісця. Травяністыя расліны адцвітаюць, марнеюць і паступова засыхаюць. У многіх раслін спеюць плады.



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫЦЦЁ РАСЛІН ВОСЕННЮ

с. 24–26

Якія дрэвы, кусты, травяністыя расліны растуць у двары вашай школы? На якіх з іх восенню вы бачылі плады?





Як рассяляюцца плады і насенне ў прыродзе? Хто і што ім дапамагае?





Збярыце восенню плады і насенне раслін для падкормкі птушак зімой.



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫЦЦЁ РАСЛІН

? Разгледзьце малюнкі. У якія колеры расфарбавана лісце розных дрэў восенню? У якіх раслін лісце ўвосень ападае?



У лісцевых дрэў лісце восенню мяняе афарбоўку і ападае. У хвойных дрэў елкі і сасны лісце-іголкі (ігліца) восенню застаецца зялёным.



Правообладатель Национальный институт образования

# ВОСЕННЮ. ЛІСТАПАД

с. 30–35

Параўнайце галінку лістоўніцы летам і восенню. Чаму гэта хваёвае дрэва так назвалі?





Ці ападае лісце ў бязветранае надвор’е? Ці ёсць ранкі ад апалага лісця на галінках дрэў?



З апалага лісця складзіце букет самастойна або зрабіце аплікацыю з бацькамі.







Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫВЁЛЫ — ЧАСТКА ЖЫВОЙ ПРЫРОДЫ.

Раскажыце, якіх жывёл вы бачыце на малюнку. Хто схаваўся за плотам? Што агульнае ва ўсіх жывёл?



Назавіце дзікіх і свойскіх жывёл на малюнку. Чым дзікія жывёлы адрозніваюцца ад свойскіх?

Дзікія жывёлы самі здабываюць ежу, будуюць жыллё, клапоцяцца пра сваё патомства.
Свойскую жывёлу разводзяць людзі. І яны клапоцяцца пра гэтых жывёл.



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫЦЦЁ ЖЫВЁЛ ВОСЕННЮ

с. 36–40, 42

Разгледзьце малюнак. Раскажыце, як восенню рыхтуюцца да зімы дзікія жывёлы.



З надыходам халадоў ко́рму для дзікіх жывёл становіцца менш. Таму адны жывёлы робяць запасы ежы, другія — хаваюцца ў зацішных месцах і ўпадаюць у спячку.

Пералётныя птушкі адлятаюць у вырай. Там яны могуць знайсці сабе корм. Звяры восенню ліняюць, мяняючы летнюю рэдкую поўсць на густую і пушыстую. У некаторых звяроў мяняецца і іх афарбоўка.



Правообладатель Национальный институт образования

# СВОЙСКІЯ ЖЫВЁЛЫ ВОСЕННЮ.

Чаму людзі разводзяць свойскіх жывёл і клапо-цяцца пра іх?



Якіх жывёл можна яшчэ намаляваць?






Правообладатель Национальный институт образования

# ПРАЦА ЛЮДЗЕЙ ВОСЕННЮ

Як змяняецца жыццё свойскіх жывёл восенню?





Якой працай восенню заняты дарослыя і дзеці? Як вы дапамагалі дарослым у восеньскіх работах?

Правообладатель Национальный институт образования

# ВОСЕНЬ І ЗДАРОЎЕ

? Чым карысныя прагулкі на свежым паветры восенню?



Як змяняюцца адзенне і абутак людзей для прагулак у асеннюю пару?

Якое сёння надвор'е? Пахмурнае? Дажджлівае? Сонечнае? Ветранае? Цёплае? Халоднае?



Правообладатель Национальный институт образования

Якое адзенне і абутак вы выбралі сёння? Чаму?

Як дзеці загартоўвалі свой арганізм летам?





Што робяць дзеці для загартоўвання восенню? Што робіце вы?

Часцей гуляйце на свежым паветры. Выбірайце адзенне і абутак для прагулак у адпаведнасці з надвор'ем. Кожны дзень прымайце душ або абцірайце цела вільготным ручніком.



Правообладатель Национальный институт образования

## АСЕННІЯ ПЛАДЫ І НАСЕННЕ —

? Разгледзьце малюнкі. Што агульнае ў пладоў раслін?



Плады ўтвараюцца на месцы кветак. Унутры пладоў знаходзіцца насенне.

Гэта плады? Чаму?





У якіх раслін да восені спеюць ядомыя плады? Якія яшчэ расліны людзі вырошчваюць для выкарыстання ў ежу?



Правообладатель Национальный институт образования

# КРЫНІЦА ЗДАРОЎЯ

с. 27–29

Назавіце садавіну і агародніну на малюнку. Чым яны карысныя?









Пра якія правілы ўжывання агародніны і садавіны нагадваюць малюнкі?

Прыгатуйце з бацькамі салат са свежай агародніны і садавіны.



Правообладатель Национальный институт образования

# АСЕННІЯ З’ЯВЫ

Якая пара года паказана на малюнках? Па якіх прыкметах вам удалося вызначыць раннюю, залатую і познюю восень?







Якія яшчэ змены ў нежывой і жывой прыродзе адбываюцца ў розныя перыяды восені?



Правообладатель Национальный институт образования

# Ў ПРЫРОДЗЕ

с. 41–44

**?** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, як жывёлы восенню рыхтуюцца да зімы.








Разгледзьце малюнкі і назавіце птушак. Якія з іх застаюцца зімаваць у Беларусі? Якія птушкі адлятаюць? Чаму?


шпак


верабей


дзяцел


галка


ластаўка


сарока


дзікая качка


бусел



Правообладатель Национальный институт образования

# ЗМЯНЕННІ Ў НЕЖЫВОЙ

Пра які месяц года кажуць: «Году пачатак, зіме сярэдзіна»? Назавіце іншыя зімовыя месяцы.



Разгледзьце малюнкі. Што змянілася ў нежывой прыродзе з надыходам зімы? Чаму зімой халадней, чым восенню?

Сонца зімой у небе падымаецца невысока. Дні кароткія. Зямля атрымлівае мала цяпла. Паветра награваецца слаба, таму звычайна бывае марознае надвор'е. Глеба замярзае. Вадаёмы пакрываюцца лёдам. Падчас снегападаў з аблокаў на зямлю падае снег. Снегапад пры моцным ветры называюць мяцеліцай або завеяй. У мяцеліцу каля дрэў, хат, платоў утвараюцца гурбы.

Дзе сняжынкі растаюць хутчэй: на руцэ ці на паліто? Чаму? У якое надвор'е снег рыпіць пад нагамі? У марознае надвор'е або ў адлігу лягчэй зляпіць снежкі?



Правообладатель Национальный институт образования

# ПРЫРОДЗЕ ЗІМОЙ

с. 47–49

**?** Разгледзьце малюнкі. Назавіце, якой формы могуць быць сняжынкі. Якія з іх вы бачылі ў прыродзе?



пласцінка



зорка



вожык



за́пінка



слупок



іголка





**?** Як можна даказаць, што снег і лёд — гэта замерзлая вада? Ці чысты белы снег?



Правообладатель Национальный институт образования

# ЯК ЗІМУЮЦЬ

? Як выглядаюць хвойныя і лісцевыя дрэвы зімой? Па якіх прыкметах можна адрозніць зімой розныя дрэвы адно ад аднаго?



Зімой можна вызначыць дрэвы і кусты па сілуэце, колеры кары, сухім лісці і пладах на галінках.



Правообладатель Национальный институт образования

# РАСЛІНЫ

с. 50–53

Разгледзьце малюнкі. Параўнайце галінкі з пупышкамі ў розных раслін. Раскажыце, як зімой пазнаць каліну і агрэст. Чым адрозніваюцца галінкі з пупышкамі ў тапол і асіны?




Пазнайце па знешнім выглядзе зімой дрэвы і кусты каля школы.

Раскажыце па малюнку, якія травяністыя расліны зімуюць з зялёным лісцем. Якія яшчэ вы бачылі? Чаму яны зімой не гінуць ад маразоў?






Правообладатель Национальный институт образования



Раскажыце, якіх жывёл можна ўбачыць зімой у нашых лясах. Хто схаваўся ў «спаленьках», схаваных ад вачэй людзей? Чаму? Чым харчуюцца зімой розныя звяры?

Хто са звяроў пакінуў у лесе гэтыя сляды на снезе?



Разгледзьце малюнкі. Назавіце жывёл, якія зімуюць у вадзе пад лёдам. Чаму людзі зімой робяць палонкі ў лёдзе?



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫВЁЛ ЗІМОЙ

с. 56, 60–61








Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫЦЦЁ ПТУШАК

?

Успомніце, якія птушкі і чаму восенню адляцелі ў вырай.



дзяцел



попаўзень



Разгледзьце малюнкі зімуючых птушак. Апішыце іх знешні выгляд. Па якіх прыкметах вы іх зможаце адрозніць у прыродзе? Чаму гэтыя птушкі не адляцелі ад нас восенню?

Гэтыя птушкі не адляцелі восенню таму, што зімой у нашых краях знаходзяць сабе корм. Яны харчуюцца пладамі, насеннем, пупышкамі раслін. Птушкі адшукваюць у расколінах кары дрэў насякомых, якія схаваліся.



Правообладатель Национальный институт образования

# ЗІМОЙ

с. 68–71

?

Чаму птушкам зімой патрэбна дапамога людзей? Як можна дапамагчы зімуючым птушкам?




Якія птушкі намаляваны каля кармушкі? Якія з іх прыляцелі на зімоўку? Які корм ядуць птушкі?



З дапамогай дарослых зрабіце кармушку і павесьце побач з домам. Насыпайце ў яе корм кожны дзень.



Правообладатель Национальный институт образования

# СВОЙСКІЯ ЖЫВЁЛЫ ЗІМОЙ.













? Як змяняецца жыццё свойскіх жывёл зімой? Як людзі пра іх клапоцяцца ў гэту пару года?

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, якімі відамі працы занятыя людзі зімой. Чаму яны гэта робяць?



Правообладатель Национальный институт образования

# ПРАЦА ЛЮДЗЕЙ ЗІМОЙ

с. 73









Зімой у дварах і на вуліцах прыбіраюць ... . (Чаму?) На палях снег аруць і ўсталёўваюць шчыты. (Навошта?) У садах снег страсаюць з дрэў. (Для чаго?) У майстэрнях да веснавой сяўбы рамантуюць сеялкі, камбайны, ... . (Што яшчэ?) У агароднінасховішчах перабіраюць агародніну. (Навошта?) У цяпліцах зімой вырошчваюць кветкі і ... . (Што яшчэ вырошчваюць?)



Правообладатель Национальный институт образования

# ЗІМА І ЗДАРОЎЕ

Як людзі клапоцяцца пра сваё здароўе зімой? Як яны апранаюцца? Чаму выбіраюць цёплую вопратку і абутак?



Паспрабуйце з сябрамі ў двары вылепіць са снегу фігуру жывёлы ці казачнага героя.



Правообладатель Национальный институт образования

с. 74–75

Якія вы ведаеце зімовыя гульні і забавы? Чым яны карысныя? Ці заўсёды бяспечныя зімовыя гульні? Хто з дзяцей ставіць пад небяспеку сваё здароўе?





Чым небяспечны снегапад на дарогах? Як трэба пераходзіць дарогу ў снегапад?



Чым небяспечная слізкая дарога? Што людзі робяць, каб не было слізка?



Чым небяспечны лёд? Растлумачце, ці можна гуляць на лёдзе вадаёмаў.



Правообладатель Национальный институт образования

# ЗІМОВЫЯ З'ЯВЫ

? Што адбываецца ў нежывой прыродзе ў зімовыя месяцы? Як змяняюцца вышыня Сонца, ападкі, глеба, вадаёмы?



? Чым важнае снежнае покрыва на зямлі для жывёл і раслін?



? Разгледзьце малюнак. Палічыце колькасць светлых і цёмных слаёў снегу. Чаму яны чаргуюцца? Пра што могуць «расказаць» абломкі галінак, крылатае насенне ў пластах снегу?



Правообладатель Национальный институт образования

с. 58, 62–66, 77

Успомніце, як зімуюць розныя расліны. Чаму рабіну і елку называюць прыроднымі кладоўкамі?



Раскажыце, якім жывёлам даспадобы яловае насенне. Як пазнаць па шышках, хто над імі працаваў?



? Разгледзьце малюнкі. У каго са звяроў дзень нараджэння заўсёды зімой? Якая птушка ўе зімой гняздо? Якая рыба зімой нерастуе? Што вам вядома пра зімоўку іншых жывёл?



Правообладатель Национальный институт образования

# МОЙ ГОРАД

Разгледзьце малюнкі. На якім з іх намаляваны горад, на якім — вёска? Растлумачце, у чым падабенства і адрозненне горада і вёскі.






Дзе вы жывяце — у горадзе ці вёсцы? Як называецца ваш населены пункт? Ці ведаеце вы, чаму ён так названы? Чым ён вам дарагі? Раскажыце.

Дзе працуюць жыхары вашага горада ці вёскі? Чым важная іх праца?


Правообладатель Национальный институт образования

## (ВЁСКА)

с. 12–19

Дзе намаляваны пасажырскі транспарт, дзе — грузавы, дзе — спецыяльны? Для чаго прызначаны кожны від транспарту? Якія віды транспарту ёсць у вашым населеным пункце?







Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, якія правілы бяспекі павінен выконваць пешаход.






Якія месцы для адпачынку ёсць у вашым населеным пункце?












Правообладатель Национальный институт образования

# Я І МАЯ СЯМ’Я

Прачытайце прыказкі народаў свету. Як вы іх разумееце? Чаму важна, каб у сям’і былі спакойныя, добрыя адносіны?

Бацькі ў дзецях працягваюцца.
Добрая сям’я дадасць розуму.
Дрэва трымаецца каранямі, а чалавек — сваякамі.
Згодную сям’ю і гора не бярэ.

Колькі чалавек у вашай сям’і? Як бацькі клапоцяцца пра дзяцей?









Раскажыце па малюнках, якія хатнія справы могуць выконваць у сям’і дзеці.

Як яшчэ вы дапамагаеце сваім блізкім у сям’і?


Правообладатель Национальный институт образования

# НЕБЯСПЕЧНЫЯ СІТУАЦЫІ Ў ДОМЕ

Разгледзьце малюнкі. Пра якія правілы бяспечных паводзін дома яны нагадваюць?








Якія нумары тэлефонаў набіраюць для тэрміновага выкліку дапамогі пры небяспечных сітуацыях дома?

**101**



**102**



**103**



**104**




Правообладатель Национальный институт образования

# ЗМЯНЕННІ Ў НЕЖЫВОЙ

? Назавіце па парадку месяцы, якія «схаваліся» ў прыказцы: «Зіма вясну палохае, ды ўсё адно растае». Як называецца першы месяц вясны?



? Што змяняецца ў нежывой прыродзе з надыходам вясны? Дапоўніце апавяданне, выкарыстоўваючы малюнак.

Вясной Сонца падымаецца ўсё вышэй над ... . Яно свеціць даўжэй і грэе мацней. У сонечныя дні неба ярка-блакітнага, амаль сіняга ... . Па небе плывуць белыя ... . Пахмурных ... мала. Снег выпадае рэдка. Затое дажджы ідуць ... . Ад вясновага цяпла растае ... . Раўчукі, якія ўтварыліся, сцякаюць у рэкі, ..., упітваюцца ў адталую ... .



Правообладатель Национальный институт образования

# ПРЫРОДЗЕ ВЯСНОЙ

с. 80

Дзе з’яўляюцца першыя праталіны і чаму? Дзе ўтвараюцца ледзяшы? Чаму?





Адкуль выцякаюць і куды цякуць першыя вясеннія ручайкі? Вакол якіх дрэў (з цёмнай або светлай карой) праталіны большыя?





На якім рысунку намаляваны крыгаход, а на якім — вясенні разліў ракі (разводдзе)? Што надыходзіць у прыродзе раней? У чым іх небяспека для людзей і жывёл?



Правообладатель Национальный институт образования

Ці можна вясной прастудзіцца? Чаму? Як засцерагчы сябе ад прастуды?







Ці чысты лёд у ледзяшах? Чаму нельга аблізваць ледзяшы?





Чаму ледзяшы збіваюць з дахаў?



Правообладатель Национальный институт образования

У якія гульні можна гуляць вясной у двары? Чаму кажуць: «Гульня — няхітрая штука, ды ў кожнай гульні навука»?



Чым адрозніваецца лёд на рацэ зімой і вясной? Якія правілы бяспечных паводзін трэба выконваць каля ракі вясной?







Правообладатель Национальный институт образования

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, чым адрозніваюцца галінкі з пупышкамі розных дрэў.




Што адбываецца вясной з пупышкамі дрэў і кустоў?





Вясной у дрэў і кустоў пачынаецца рух соку. На іх галінках набры́ньваюць пупышкі і распускаецца лісце. Многія дрэвы і кусты зацвітаюць.



Правообладатель Национальный институт образования

# АБУДЖЭННЕ РАСЛІН

с. 81–88

?

Разгледзьце малюнкі. Які куст зацвітае вясной першы? Якія дрэвы цвітуць ранняй вясной? Чым дзіўныя іх кветкі?


ляшчына


вольха


вярба


асіна


падбел


сон


першацвет


медуніца


пралеска


ве́траніца

Якія травяністыя расліны цвітуць ранняй вясной? Якія з іх і дзе вы бачылі ў прыродзе? Чаму да раннеквітнеючых раслін трэба адносіцца беражліва?



Правообладатель Национальный институт образования

## ЗМЯНЕННІ Ў ЖЫЦЦІ ДЗІКІХ

Разгледзьце малюнкі. Якіх насякомых і дзе можна ўбачыць у пачатку вясны? Чым яны харчуюцца?





Раскажыце па малюнку, як змянілася жыццё жывёл з надыходам вясны. Як іншыя дзікія жывёлы сустракаюць вясну?



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫВЁЛ ВЯСНОЙ

с. 90–94, 96–98, 104

**?** Якая птушка першая вяртаецца вясной у наш край? Якія птушкі прылятаюць пазней? Чаму?



Якіх яшчэ птушак вы ведаеце? Калі яны прылятаюць?




Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, чым занятыя птушкі вясной. Чаму і як іх трэба ахоўваць у гэту пару года?



Правообладатель Национальный институт образования

# СВОЙСКІЯ ЖЫВЁЛЫ ВЯСНОЙ.

? Як змяняецца жыццё свойскіх жывёл з надыходам вясны? Як людзі клапоцяцца пра свойскіх жывёл у гэту пару года?

















? Навошта вясной шпакі і галкі «катаюцца верхам» на каровах і конях?



Правообладатель Национальный институт образования

# ПРАЦА ЛЮДЗЕЙ ВЯСНОЙ

с. 99

Чым вясной заняты людзі на палях, у садах, парках, на вуліцах гарадоў і вёсак? Чаму гэтыя работы выконваюцца вясной?



Чаму вясной людзі спяшаюцца своечасова пасеяць і высадзіць у глебу расліны?

У якіх вясенніх работах вы дапамагаеце дарослым?



Правообладатель Национальный институт образования

## ВЯСЕННІЯ З'ЯВЫ

Прачытайце. Замест пропускаў устаўце назвы вясенніх месяцаў. Назавіце іншыя прыкметы вясны ў прыродзе.

Першыя вясеннія праталіны і капе́ж. Гэта бывае ў ... .

Бурнае раставанне снегу. Цвіценне першацветаў. Вылет чмялёў. Гэта бывае ў ... .

Першае клейкае лісце. Цвіценне дрэў у садах. Квітнеючыя ландыш і бэз. Гэта бывае ў ... .



Разгледзьце малюнкі. Назавіце аб'екты нежывой і жывой прыроды. Якія змены з імі адбываюцца вясной?



Пазнайце па сілуэтах жывёл. Як змяняецца іх жыццё вясной?



Правообладатель Национальный институт образования

с. 95, 100–103, 106

Прачытайце апавяданне па ланцужку і дапоўніце яго.

Вясной у родны край вяртаюцца пералётныя птушкі. (Дзе яны былі?)

Раней за ўсіх прылятаюць птушкі, якія могуць пракарміцца на праталінах. (Якія?)

Калі з вадаёмаў сыходзіць лёд, прылятаюць вадаплаўныя птушкі. (Гэта хто?)

Пазней за іншых з'яўляюцца птушкі, кормам якім служаць насякомыя. (Хто гэта?)

Для выседжвання яек і выкормлівання птушанят птушкі ладзяць гнёзды на галінках, у дуплах дрэў. (Дзе яшчэ?)



Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, у якіх звяроў вясной з'яўляюцца дзіцяняты. У каго яшчэ з'яўляецца патомства? Як дарослыя жывёлы клапоцяцца пра сваё патомства?



Правообладатель Национальный институт образования

# ЗМЯНЕННІ Ў НЕЖЫВОЙ ПРЫРОДЗЕ

Раскажыце па малюнках пра змены ў нежывой прыродзе летам. Чаму летам цяплей, чым вясной?








Якія з гэтых травяністых раслін вы бачылі ў прыродзе? Якія яшчэ расліны цвітуць летам?



Правообладатель Национальный институт образования

# І ЖЫЦЦІ РАСЛІН ЛЕТАМ

с. 106–116, 126

У якіх раслін летам спеюць ягады? Якія ягады можна збіраць летам?

## ЯДОМЫЯ ЯГАДЫ



суніцы



чарніцы



маліны



брусніцы



чорныя парэчкі

## НЕЯДОМЫЯ ЯГАДЫ



воўчыя ягады



ландыш



крушына



мудра́нка



бузіна́ чырвоная

Якое дрэва ў нашым краі цвіце летам?



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫЦЦЁ ДЗІКІХ І СВОЙСКІХ

**?** Якія дзікія жывёлы паказаны на малюнках? Як дарослыя клапоцяцца пра птушанят і дзіцянят?



**?** Што вам вядома пра жыццё іншых дзікіх жывёл летам?



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖЫВЁЛ ЛЕТАМ

с. 118–124

Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, як людзі клапоцяцца пра свойскіх жывёл летам. Якую дапамогу дарослым могуць аказаць дзеці?





? Якія правілы паводзін у прыродзе паказаны на малюнках? Чаму іх трэба выконваць?



Правообладатель Национальный институт образования

# ЛЕТА І ЗДАРОЎЕ

Раскажыце па малюнку, што летам робяць дзеці для загартоўвання арганізма. Якія правілы бяспекі парушаюць некаторыя з іх?



?

Як вы клапоціцеся пра сваё здароўе летам?



Правообладатель Национальный институт образования

с. 127–129

Разгледзьце малюнкі. Складзіце правілы бяспечных паводзін летам у прыродзе.















Правообладатель Национальный институт образования

# ЗМЯНЕННІ Ў ПРЫРОДЗЕ І ПРАЦЫ

? Як людзі даглядаюць расліны ў садах у розныя поры года?









Якую яшчэ работу людзі выконваюць у садах на працягу года? Чаму важна гэта рабіць?



Правообладатель Национальный институт образования

## ЧАЛАВЕКА Ў РОЗНЫЯ ПОРЫ ГОДА

Разгледзьце малюнкі. Як дзеці дапамагаюць дарослым на палях, агародах, вуліцах гарадоў і вёсак у розныя поры года?













У якіх работах вы дапамагалі дарослым у розныя поры года? Што вам асабліва падабаецца рабіць?



Правообладатель Национальный институт образования

# ЗМЕСТ

Наша Радзіма — Беларусь .............................................. 4

Што такое прырода ...................................................... 6
Жывая і нежывая прырода ............................................. 8

Змяненні ў нежывой прыродзе восенню ............................... 10
Расліны — частка жывой прыроды. Жыццё раслін восенню 12
Жыццё раслін восенню. Лістапад .................................... 14
Жывёлы — частка жывой прыроды. Жыццё жывёл восенню 16
Свойскія жывёлы восенню. Праца людзей восенню.............. 18
Восень і здароўе чалавека .............................................. 20
Асеннія плады і насенне — крыніца здароўя ..................... 22
Асеннія з'явы ў прыродзе ............................................... 24

Змяненні ў нежывой прыродзе зімой ................................. 26
Як зімуюць расліны ...................................................... 28
Жыццё дзікіх жывёл зімой ............................................. 30
Жыццё птушак зімой ...................................................... 32
Свойскія жывёлы зімой. Праца людзей зімой ...................... 34
Зіма і здароўе чалавека ................................................. 36
Зімовыя з'явы ў прыродзе .............................................. 38

Мой горад (вёска) ......................................................... 40
Я і мая сям'я ............................................................... 42
Небяспечныя сітуацыі ў доме .......................................... 43

Змяненні ў нежывой прыродзе вясной ................................ 44
Вясна і здароўе чалавека ............................................... 46
Вясна — час абуджэння раслін ........................................ 48
Змяненні ў жыцці дзікіх жывёл вясной ............................... 50
Свойскія жывёлы вясной. Праца людзей вясной ................... 52
Вясеннія з'явы ў прыродзе ............................................. 54

Змяненні ў нежывой прыродзе і жыцці раслін летам............ 56
Жыццё дзікіх і свойскіх жывёл летам ................................ 58
Лета і здароўе чалавека ................................................. 60
Змяненні ў прыродзе і працы чалавека ў розныя поры года 62

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва і нумар установы агульнай сярэдняй адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Трафімава** Галіна Уладзіміраўна
**Трафімаў** Сяргей Анатольевіч

**ЧАЛАВЕК І СВЕТ**

Вучэбны дапаможнік для 1 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Б. Сопат*
Мастакі *Д. М. Матарыкін, Л. А. Пастушэнка, А. А. Праваловіч, А. П. Пратасеня, В. У. Фралова*
Мастацкія рэдактары *М. Я. Шкурпіт, А. П. Пратасеня*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*
Карэктары *К. В. Шобік, Л. Г. Ганчарэнка*

Падпісана ў друк 05.05.2017. Фармат 60×84 $^{1}/_{8}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 6,8. Тыраж 17 700 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования